**УДК [94(476.7)+ 356.15 (476.7:438)(0.91)]"1941/1944"** **DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-80-85**

# УЗАЕМААДНОСІНЫ БЕЛАРУСКІХ ПАРТЫЗАН З ПОЛЬСКІМ ПАДПОЛЛЕМ НА ТЭРЫТОРЫІ БАРАНАВІЦКАЙ ВОБЛАСЦІ (1941–1944): АРГАНІЗАЦЫЙНЫ І БАЯВЫ АСПЕКТ

***канд. гіст. навук, дац. А.А. КРЫВАРОТ***
***(Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск)***

*У артыкуле разгледжаны ўзаемаадносіны партызанскіх фарміраванняў Беларусі з польскім падполлем на акупаванай гітлераўскай Германіяй тэрыторыі Баранавіцкай вобласці ў 1941–1944 гг., прадстаўленае, з аднаго боку, польскімі прасавецкімі структурамі, з другога – адзінкамі, якія былі падпарадкаваны польскаму эміграцкаму ўраду ў Лондане. Зроблена выснова, што мясцовыя савецкія падпольныя і партызанскія структуры імкнуліся аператыўна наладжваць узаемадзеянне з узнікшымі групамі польскага прасавецкага падполля і накіроўваць іх дзейнасць на актыўную барацьбу з нямецкімі акупантамі. Арганізаваныя на аснове такіх груп партызанскія адзінкі звычайна адразу ўключаліся ў склад беларускіх атрадаў і брыгад. Паказаны асноўныя фактары, якія ўплывалі на характар узаемаадносін беларускіх партызан і структур Арміі Краёвай у розныя перыяды германскай акупацыі. Раскрыты змест і формы ўзаемаадносін беларускіх партызан і «акаўцаў» на працягу двух этапаў: ліпень 1941 г. – вясна 1943 г. і лета 1943 г. – ліпень 1944 г.*

***Ключавыя словы****: аперацыя, атрад, брыгада, гарнізон, злучэнне, падполле, узаемаадносіны.*

**Уводзіны.** Праблема антыгерманскага ўзброенага супраціўлення ў заходніх абласцях Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай Вайны па-ранейшаму прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Галоўнай сілай, якая змагалася ў Баранавіцкай вобласці з акупантамі, былі савецкія партызаны. Акрамя таго, тут дзейнічала польскае прасавецкае падполле. Яно пэўны час функцыянавала самастойна. Пасля пераходу да партызанскіх метадаў барацьбы групы ўваходзілі ў склад беларускіх атрадаў і брыгад асобнымі баявымі адзінкамі. Таксама на тэрыторыі вобласці аперыравалі структуры, што падпарадкоўваліся польскаму ўраду ў Лондане. Уяўляе цікавасць, якім чынам складваліся ўзаемаадносіны паміж названымі суб'ектамі антыгерманскага супраціўлення на тэрыторыі вобласці ў 1941–1944 гг.

Узаемаадносіны і кантакты партызан са структурамі Арміі Краёвай (АК) пэўным чынам разглядаліся ў калектыўных выданнях [1–3], працах А.М. Літвіна [4–6], манаграфіях З. Барадзіна [7], С.А. Сіткевіча [8], публікацыях В.І. Ермаловіча і С.В. Жумара [9], Я.І. Сямашкі [10] і інш. Асобныя звесткі аб узаемадзеянні партызан і прасавецкага польскага падполля ў Баранавіцкай вобласці прысутнічаюць у кнігах З. Барадзіна [7], Я.І. Сямашкі [10], Э.Ф. Языковіч [11], брашуры Г.Дз. Кнацько [12]. Пры гэтым названая праблема ў межах згаданага рэгіёна яшчэ комплексна не даследавалася з прычыны адсутнасці спарадкаванай гістарыяграфічнай базы.

У артыкуле пастаўлена задача на аснове звестак, змешчаных у калетыўных выданнях, працах гісторыкаў, зборніках успамінаў, архіўных дакументах, асвятліць узаемаадносіны партызан з польскім прасавецкім падполлем, структурамі АК у час германскай акупацыі тэрыторыі вобласці.

**Асноўная частка.** У заходніх абласцях Беларусі, далучаных да БССР у канцы 1939 г., польскае антысавецкае падполле стала структурна афармляцца пасля загаду прэм'ера эміграцыйнага ўрада У. Сікорскага ад 13 лістапада 1939 г. аб стварэнні кадравай арганізацыі «Саюз узброенай барацьбы» (СУБ). Заходнюю Беларусь гэта структура, як і ўрад У. Сікорскага, разглядала як польскую, таму дзейнасць СУБ была скіравана на падрыў савецкай улады і рэпрэсіі супраць яе актыву. У сувязі з гэтым польскае антысавецкае падполле ў заходніх абласцях БССР жорстка праследвалася з боку органаў НКУС-НКДБ СССР [1, с. 277; 4, с. 67; 6, с. 114; 10, 29–35].

Сітуацыя для польскага падполля, якое падпарадкоўвалася эміграцыйнаму ўраду, змянілася пасля нападу гітлераўскай Германіі на СССР. 30 ліпеня 1941 г. быў падпісаны дагавор аб аднаўленні дыпламатычных адносін паміж Савецкім Саюзам і Польшчай і супрацоўніцтве ў вайне. Важнае значэнне для нармалізацыі адносін мела абвяшчэнне 14 жніўня 1941 г. дэкларацыі аб сумеснай барацьбе СССР і Польшчы з фашызмам. Пагадненні прывялі да часовага аслаблення савецка-польскага канфлікту, бо вырашэнне пытання аб межах адкладвалася. Польскае падполле магло ў пэўнай ступені пазіцыяніраваць сябе як антыгерманскае [1, с. 278;3, с. 19; 4, с. 69; 6, с. 115–116;10, с. 55–56].

Галоўнай сілай, якая вяла жорсткую барацьбу з немцамі, быў савецкі партызанскі рух. Яго станаўленне ў рэгіёне адбывалася ў надзвычай складаных умовах, што было абумоўлена хуткім прасоўваннем немцаў углыб СССР, кароткім існаваннем у вобласці савецкай улады, адсутнасцю зараней створаных падпольных цэнтраў і г.д. Партызанскія структуры пачалі разгортвацца ўжо летам 1941 г. З аднаго боку, гэта былі групы ваеннаслужачых, якія з розных прычын засталіся ў тыле ворага. У барацьбу таксама ўключыўся савецкі актыў. Нярэдка такія групы аб'ядноўваліся ў адну баявую адзінку. Летам – восенню 1941 г. у Быценьскім і Слонімскім раёнах сталі дзейнічаць групы І.С. Казялецкага, А.В. Фідрыка, Г.А. Дудко, А.Ф. Персіянцава, С.І. Грышчанкі, П.В. Пранягіна і інш. Групы аформіліся таксама ў Валожынскім, Івянецкім, Лідскім, Навагрудскім, Шчучынскім раёнах. Не ўсе адзінкі змаглі захаваць сваю баяздольнасць да пачатку 1942 г. з прычыны тэрору акупантаў, недахопу зброі, боепрыпасаў, прадуктаў, медыкаментаў, слабой сувязі з насельніцтвам [7, с. 59–61; 13, с. 117; 14, с. 22;15, с. 9–10; 16, с. 163].

Працэс стварэння партызанскіх груп паскорыўся пасля перамогі Чырвонай арміі пад Масквой. Зімой – вясной 1942 г. у розных раёнах паўсталі да 20 груп, якія затым афармляліся ў атрады (напрыклад, атрад на чале

з Б.А. Булатам). Некалькі падраздзяленняў перамясціліся ў рэгіён з суседніх абласцей. У канцы чэрвеня 1942 г. у Налібоцкую пушчу перайшоў разведатрад РСЧА В.В. Шчарбіны. Падраздзяленне мела радыёстанцыю для сувязі з Цэнтрам, запас узрыўчаткі і вопытных падрыўнікоў, што садзейнічала актывізацыі баявой дзейнасці мясцовых партызан. У жніўні 1942 г. вакол атрада аб'ядналіся некалькі падраздзяленняў і ўтварылі Асобнае злучэнне партызанскіх атрадаў (АЗПА) на чале з В.В. Шчарбінай, якое ў канцы лета ўжо налічвала больш за 500 байцоў. Дзейнасць АЗПА адыграла прыкметную ролю ў станаўленні партызанскага руху на тэрыторыі вобласці. Ад лістапада 1942 г. і да 11 красавіка 1943 г. (пачатак дзейнасці Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б) па загадзе камандавання АЗПА ў Налібоцкай і Ліпічанскай пушчах былі створаны 4 брыгады з 5-ці існаваўшых на той час у рэгіёне. На канец 1942 г. у вобласці налічвалася 26 атрадаў [13, с. 323–325; 14, с. 11, 20, 31, 43; 15, с. 192–193; 17, л. 2, 2аб, 3, 5, 8; 18, л. 3; 19, л. 40].

Функцыянаванне падпольнага абкама КП(б)Б паспрыяла таму, што з красавіка да ліпеня 1943 г. колькасць брыгад у рэгіёне павялічылася ў два разы, атрадаў – у паўтара разы, а да канца 1943 г. – у чатыры і тры разы, адпаведна. Для падвышэння аператыўнасці ў кіраванні партызанскімі сіламі вобласці былі створаны Баранавіцкае злучэнне і чатыры злучэнні па зонах: Івянецкае, Шчучынскае, Лідскае, Стаўбцоўскае. Партызаны вобласці ў другой палове 1943 г. уяўлялі сабой баяздольную сілу, з якой былі вымушаны лічыцца як нямецкія акупанты, так і падпольныя структуры АК. Да таго ж у вобласць на працягу 1943 г. з усходу Беларусі былі перабазіраваны каля 15 атрадаў, а з савецкага тылу перапраўлены 8 падраздзяленняў. На час вызвалення Беларусі ў ліпені 1944 г. у вобласці налічвалася больш за 22 тыс. байцоў [7, с. 67; 14, с. 25, 26–27, 31, 43, 62, 67; 15, с. 17, 39].

Да пачатку нямецкай акупацыі ў рэгіёне пражывала даволі вялікая колькасць палякаў. Сярод іх былі як мясцовыя жыхары, так і тыя, хто з розных прычын перамясціўся сюды пасля захопу германскімі войскамі Польшчы ў верасні 1939 г. Прасавецкі настроеныя палякі аказвалі разнастайную дапамогу савецкім партызанам: перадавалі зброю, аддзенне, медыкаменты, давалі прытулак. Палякі стваралі аўтаномныя падпольныя і партызанскія адзінкі ці ўступалі ў беларускія атрады і брыгады, дзе з іх ліку стваралі аддзяленні, узводы, роты, атрады. У Баранавіцкім злучэнні, па няпоўных падліках, змагалася больш за 1000 прадстаўнікоў польскай нацыянальнасці. Першыя кантакты партызан і польскага прасавецкага падполля мелі месца ўжо ў 1942 г. У Мірскім раёне, непадалёку ад беларускай групы, на базе якой пазней аформіўся атрад «Камсамолец» (камандзір А. Саяцэвіч), размяшчалася польская баявая адзінка колькасцю да 20 чалавек. Першыя сумесныя аперацыі былі праведзены ў жніўні – верасні 1942 г., калі партызаны напалі на нямецкія гаспадаркі ў вёсках Обрынь, Рэп'ева, Краснагоркі, Некрашэвічы і спалілі вялікую колькасць збожжа, разграмілі склады з прадуктамі, падрыхтаванымі для адпраўкі ў Германію. Аб'ектамі сумесных удараў станавіліся ўчасткі чыгункі Баранавічы – Мінск, паліцэйскія ўчасткі і ўправы, лініі сувязі [10, с. 130; 14, с. 73; 20, с. 228].

Адным з першых атрадаў, дзе большасць складалі палякі, было падраздзяленне на чале з А. Свентаржыцкім, сфарміраванае з жыхароў Івянецкага і Валожынскага раёнаў, а таксама групы Я.Дз. Васюціна. Атрад з ліпеня па верасень 1942 г. уваходзіў у склад АЗПА, а затым быў расфарміраваны. Групы А. Свентаржыцкага і Я.Дз. Васюціна да канца 1942 г. дзейнічалі самастойна, а затым увайшлі ў брыгаду імя В.П. Чкалава. Трэба адзначыць, што А. Свентаржыцкі пэўны час быў прыхільнікам АК, але затым парваў з гэтай структурай [14, с. 94; 17, л. 5; 20, с. 197].

Актывізаваліся кантакты партызан і польскага прасавецкага падполля пасля стварэння 1 сакавіка 1943 г. на тэрыторыі СССР арганізацыі «Саюз польскіх патрыётаў» (СПП), а таксама з агульным уздымам антыгерманскага супраціўлення ў шмат якіх раёнах вобласці. Кантакты праяўляліся як у баявым, так і ў арганізацыйным плане. У складзе атрада Р.Л. Кудрына брыгады імя В.І. Чапаева палякі ў ноч з 7 на 8 мая 1943 г. удзельнічалі ў разгроме гарнізона ў Налібоках. Вясной 1943 г. у брыгаду імя В.П. Чкалава ўліліся дзясяткі палякаў. Па рашэнні яе штаба ў маі 1943 г. была створана польская група, на базе якой планавалася стварыць атрад. Для партызан-палякаў быў устаноўлены спецыяльны знак – бела-чырвоная стужка на фуражцы [10, с. 130; 12, с. 7; 20, с. 188].

Для правядзення работы сярод польскага насельніцтва камандаванне брыгады імя В.П. Чкалава вясной–летам 1943 г. з дазволу падпольнага абкама арганізавала некалькі рэйдаў групы А. Свентаржыцкага. Яна прайшла па тэрыторыі Валожынскага, Івянецкага, Стаўбцоўскага, Мірскага і іншых раёнаў. Партызаны-палякі інфармавалі насельніцтва аб зверствах немцаў у Польшчы, распаўсюджвалі інфармацыйныя зводкі, раздавалі тэксты зваротаў СПП, выкрывалі палітыку эмігранцкага ўрада ў Лондане. Група праводзіла і баявую работу – нападала на патрулі і пасты, разбурала лініі сувязі. У ліпені 1943 г. група А. Свентаржыцкага мела ў сваім складзе 50 байцоў і прыняла ўдзел разам з партызанамі брыгад М.І. Грыбанава і П.І. Гулевіча ў баях з гітлераўцамі падчас блакады Налібоцкай пушчы. Польская група ўзаемадзейнічала з атрадам імя С.М. Кірава каля вёскі Печышча пры абароне партызанскага аэрадрома. 28 ліпеня 1943 г. разведгрупа праціўніка колькасцю 40–60 чалавек пад выглядам польскіх партызан пранікла ў раён вёскі Печышча, дзе артымала адпор польскіх байцоў на чале з І. Ф. Мархвінскім са складу брыгады імя В.П. Чкалава. Ва ўзнагародным лісце, падпісаным у 1944 г., І.Ф. Мархвінскі паказаны як камандзір атрада брыгады [17, л. 96, 245; 20, с. 190, 197].

Восенню 1943 г. на базе групы А. Свентаржыцкага быў створаны атрад «26 год Кастрычніка». За кароткі тэрмін на яго баявым рахунку налічвалася некалькі скінутых пад адхон эшалонаў. Паспяхова дзейнічала на шашэйных камунікацыях польская група В. Навадворскага. У даведніку «Партизанские формирования...» датай арганізацыі атрада названа 26 кастрычніка 1943 г, а вось прозвішча камандзіра паказана толькі з сакавіка 1944 г. (І.Л. Еўсцягнееў). Няма таксама згадкі пра тое, што атрад створаны на базе групы палякаў. Указана толькі аб афармленні атрада на базе рэзервовай групы брыгады. З набліжэннем лініі фронту летам 1944 г. пры Баранавіцкім

злучэнні быў створаны атрад на чале М. Голдысам, які затым перамясціўся на тэрыторыю Польшчы [8, с. 261; 14, с. 23. 34, 94; 17, л. 96, 202; 20, с. 190].

На працягу 1943 г. партызаны-палякі ваявалі ў складзе многіх атрадаў вобласці. Партызаны аддзялення (камандзір Я.С. Міканоўскі) у складзе атрада імя Г.К. Жукава ў маі 1943 г. удзельнічалілі ў падрыве эшалона з нафтай. У жніўні – верасні 1943 г. сфарміраваны на яго аснове ўзвод вызначыўся ў «рэйкавай вайне», а ў лістападзе 1943 г. нападаў з засады на нямецкі транспарт. У пачатку 1944 г. польская рота выконвала заданне па наладжванні сувязей з партызанскімі атрадамі ў Слонімскім раёне. Пасля сустрэчы атрада імя Г.К. Жукава з часцямі Чырвонай арміі партызаны-палякі ўступілі ў Войска Польскае. Адзначым, што ў некаторых партызанскіх фарміраваннях, нягледзячы на нямалую колькасць палякаў, асобныя адзінкі не ствараліся. Так, у брыгадзе імя А.В. Суворава было каля 50 палякаў. Некалькі дзясяткаў палякаў ваявала ў брыгадзе имя М.А. Шчорса. Палякі ў атрадзе «Камсамолец» брыгады «Камсамолец», атрадзе «1 Мая» брыгады «Перамога» ў жніўні і верасні 1943 г. праводзілі дыверсіі на лініі Стаўбцы – Гарадзея. Удалым быў напад уноч з 5 на 6 верасня 1943 г. на гарнізон у Сялевічах каля Нясвіжа. [10, с. 130–131; 20, с. 190, 206–209].

У складзе беларускіх брыгад і атрадаў былі баявыя адзінкі з палякаў, якія раней дзейнічалі самастойна і супрацоўнічалі з савецкімі партызанамі, але падтрымлівалі кантакты са структурамі АК. Да такіх адносілася група на чале з П. Крэта ў Налібоцкай пушчы. У 1944 г. група перабазіравалася на Захад, дзе на яе базе пры Васілішкаўскім антыфашысцкім камітэце польскіх патрыётаў у пачатку лета быў створаны атрад імя В. Васілеўскай (камандзір В.І. Альхімовіч) [8, с. 261; 14, с. 48; 20, с. 233].

На тэрыторыі вобласці сярод адзінак польскага падполля, у тым ліку і ваеннага, пераважалі структуры АК. Урад У. Сікорскага пасля падпісання савецка-польскіх пагадненняў актыўна заняўся пашырэннем і ўмацаваннем падполля на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Паступова СУБ з кадравай арганізацыі разгортвалася ў масавую за кошт аб'яднання падпольных вайсковых структур і прытоку мясцовага насельніцтва. Паводле распараджэння лонданскага эміграцыйнага ўрада ад 14 лютага 1942 г. на аснове СУБ была створана АК [2, с. 138–139;4, с. 70–71; 8, с. 212; 10, с. 110].

Тэрыторыя вобласці была месцам размяшчэння структур Навагрудскай акругі АК. Першым камендантам акругі быў М. Крайнік, якога потым змяніў Я. Праўдзіц-Шляскі. У пачатковы перыяд арганізацыйнымі мерапрыемствамі ў акрузе АК займаліся 62 афіцэры і 250 падафіцэраў. Акруга ўключала 8 абводаў. Арганізацыйна-баявая дзейнасць структур АК была падпарадкавана палажэнням плана ўсеагульнага паўстання, распрацаванага на перыяд восень 1941 – восень 1942 г. Галоўным камандаваннем СУБ-АК. План прадугледжваў розныя формы змагання – ад падпольнай барацьбы і да стварэння канспіратыўных атрадаў гатоўнасці да партызанскага руху. У верасні 1942 г. кіраўніцтвам АК было прынята рашэнне аб актывізацыі партызанскай дзейнасці ва ўсходніх акругах, што тлумачылася найперш узмацненнем тэрору з боку германскіх акупантаў, а таксама ростам сіл беларускіх партызан. Першы ўзброены атрад Навагрудскай акругі АК аформіўся ўжо ў чэрвені 1942 г. на тэрыторыі Шчучынскага абвода АК, а ў маі 1943 г. канчаткова легалізаваўся, стаў лясным і атрымаў парадкавы нумар 301. Пры гэтым камандаванне акругі да 1943 г. не выдавала ніякіх загадаў на арганізацыю лясных падраздзяленняў [7, с. 41–42; 8, с. 217; 10, с. 134].

У першай палове 1943 г. Галоўнае камандаванне АК стала рабіць акцэнт на разгортванне лясных атрадаў на аснове існуючай канспіратыўнай сеткі. Каб трымаць пад кантролем гэты працэс, яно накіроўвала туды сваіх эмісараў, якія затым станавіліся на чале баявых структур АК. Вясной – летам 1943 г. у акрузе былі арганізаваны 8 атрадаў. Адначасова ішоў працэс узбуйнення структур: на базе атрадаў ствараліся батальёны, а на іх аснове – палкі. У час падрыхтоўкі да акцыі «Бура» былі дадаткова створаны Нясвіжскі і Баранавіцкі батальёны АК. Усяго ў складзе акругі АК да лета 1944 г. было ад 7,5 да 8 тыс. чалавек [5, с. 66; 6, с. 123; 7, с. 42, 44; 10, с. 135–136].

Прадстаўнікі беларускіх партызан і польскага падполля СУБ-АК спрабавалі ўзгадняць свае дзеянні ўжо ў канцы 1941 – пачатку 1942 г. Першы час пасля аднаўлення дыпламатычных адносін Масква ў інтарэсах развіцця антыгерманскага супраціўлення не забараняла партызанам кантакты з польскім падполлем, аднак у той самы час арыентавала на правядзенне разведкі ў структурах АК. Польскі эмігранцкі ўрад таксама арыентаваў свае структуры адносна стасункаў з беларускімі партызанамі і падпольшчыкамі. У Навагрудскай акрузе АК для дзейнасці ў такім напрамку ў пачатку 1942 г. была арганізавана разведка і контрразведка. У 1941–1942 гг. савецкі партызанскі рух і структуры СУБ-АК у вобласці ўзнікалі і дзейнічалі паралельна, стараліся пазбягаць шчыльных кантактаў. За несанкцыянаваныя сувязі і супрацоўніцтва з партызанамі камандаванне акругі АК прымала да падначаленых суровыя меры пакарання. У канцы 1942 г. камандзір Навагрудскага абводу АК Л. Нератовіч быў зняты з пасады за наладжванне без дазволу сувязі з партызанамі і «накіраванне да іх дэканспіраваных членаў падполля» [2, с. 145;4, с. 71; 7, с. 53, 91, 93; 8, с. 217, 245–247].

Узаемаадносіны паміж беларускімі партызанамі і падполлем СУБ-АК праяўляліся ў заключэнні дамоўленасцей аб месцах дыслакацыі, абмене разведдадзенымі і інфармацыяй пра магчымыя нямецкія аблавы і арышты, узаемадапамозе зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі, правядзенні адзінкавых сумесных баявых аперацый і інш. Вясной – летам 1942 г. у сувязі з антыпольскімі акцыямі нямецкага рэжыму, удзельнікі падполля АК шукалі падтрымкі ў партызан. Найбольшая колькасць фактаў баявых кантактаў партызан і структур АК прыпала на перыяд ад другой паловы 1942 г. – да лета 1943 г. Пры іх дапамозе з лагера ў г. Маладзечна былі вызвалены некалькі сотняў савецкіх ваеннапалонных, якія затым уліліся ў беларускія атрады. У гэтым жа раёне ў жніўні 1942 г. партызаны і «акаўцы» правялі сумесна дзве аперацыі: была знішчана калона на чале з навагрудскім гебіткамісарам і ажыццёўлены напад на атрад эсэсаўцаў. Аднак сумесныя аперацыі ў 1942 г. праводзіліся не толькі рэдка, але і насуперак інструкцыям Галоўнага камандавання АК, якое ў якасці галоўнай задачы разгладала ўмацаванне структур для будучага паўстання.

Пры гэтым некаторыя лясныя групы АК у Налібоцкай пушчы па першым часе падпарадкоўваліся камандаванню беларускіх атрадаў, якія ўжо мелі свае пастаянныя базы. Па меры ўмацавання сваіх пазіцый байцы АК пераходзілі да самастойных дзеянняў [1, с. 282; 8, с. 147–149; 10, с. 152, 157, 163].

Хаця з вясны 1943 г. стала выразна праяўляцца тэндэнцыя на канфрантацыю паміж партызанамі Баранавіцкага злучэння і структурамі Навагрудскага АК, мелі месца асобныя выпадкі ўзгодненых удараў па акупантах. Так, 19–20 чэрвеня 1943 г. сумесна быў разгромлены гарнізон у Івянцы, што дазволіла Стаўбцоўскаму атраду АК захапіць вялікую колькасць зброі. Падчас карнай аперацыі «Герман» (1.07–11.08. 1943 г.) у раёне Налібоцкай пушчы на сумеснай нарадзе камандавання беларускіх партызан і атрада АК К. Мілашэўскага былі вызначаны ўчасткі абароны і тактыка ўзаемадзеяння. Амаль тры тыдні партызаны разам з «акаўцамі» адбівалі наступленне акупантаў, а потым групамі з баямі прабівалі блакаду карнікаў [5, с. 67; 7, с. 46; 10, с. 158; 17, л. 36, 45].

У перыяд з 1942 г. і да вясны 1943 г. паміж партызанамі і структурамі АК, хаця і мелі месца канфлікты, аднак яны не насілі адкрытай і жорсткай канфрантацыі. Па-першае, сітуацыя на савецка-германскім фронце яшчэ заставалася для Чырвонай арміі даволі цяжкай. Па-другое, палітычныя супярэчнасці паміж кіраўніцтвам СССР і польскім эміграцкім урадам яшчэ не знаходзіліся ў крайне абвостраным стане. Па-трэцяе, партызаны ў заходніх абласцях яшчэ не мелі дастатковай перавагі. Па-чацвёртае, структуры АК да вясны 1943 г. існавалі ў канспіратыўнай форме і не ўяўлялі вялікай небяспекі для партызан. Барацьба паміж партызанамі і ляснымі атрадамі АК вялася ў асноўным за сферы ўплыву, звязаныя з забеспячэннем прадуктамі, адзеннем, зброяй і г.д.

У сувязі з пераломам у вайне на савецка-германскім фронце ў пачатку 1943 г. на карысць Чырвонай арміі савецкае кіраўніцтва стала паступова мяняць сваё стаўленне да польскага падполля, арыентаванага на ўрад у Лондане. У студзені 1943 г. П.К. Панамарэнка накіраваў дакладную ў ЦК УКП(б) пад назвай «О поведении поляков и некоторых наших задачах», дзе была выказана прапанова зрабіць некаторыя захады «па распальванні партызанскай вайны на тэрыторыі Польшчы» [8, с. 260; 22, л. 230]. У пастанове V Пленума ЦК КП(б)Б (26–28 лютага 1943 г.) была падкрэслена важнасць «усиления работы в западных областях Беларуси в целях дальнейшего расширения партизанского движения и вовлечения в него широких масс трудящихся, а также в противовес ведущейся националистической обработке населения со стороны различных польских нелегальных организаций» [22, л. 136]. Крытычныя наступствы для адносін Масквы і ўрада У. Сікорскага мела «Катынская справа», якая набыла шырокі рэзананс у красавіку 1943 г. і стала нагодай разрыву дыпламатычных адносін [7, с. 220; 8, с. 261].

Ад другой паловы вясны 1943 г. узброенае супрацьстаянне паміж партызанамі і структурамі АК набыло пастаянны характар. Атрад імя К.Я. Варашылава 12 мая 1943 г. у раёне вёскі Баяры падвергся нападу падраздзялення АК. У выніку загінула пяць партызан. Праціўнік таксама панёс страты. Раптоўны ўдар групы АК 11 чэрвеня 1943 г. па партызанах Ленінскай брыгады каля вёскі Баяры Смальянскія Жалудоцкага раёна прывёў да гібелі 16 байцоў. Толькі за май – чэрвень 1943 г. адбылося 10 узброеных сутычак паміж партызанамі і «акаўцамі» [1, с. 282; 2, с. 146–147; 7, с. 233–234].

У новай ваенна-палітычнай сітуацыі жорсткая лінія адносін да структур АК была зафіксавана ў пастанове ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1943 г. «О мерах по дальнейшему развёртыванию партизанского движения в западных областях Белоруссии» і закрытым лісце «О военно-политической работе в западных областях БССР». У іх асабліва падкрэслівалася, што заходнія вобласці з'яўляюцца неад'емнай часткай БССР і на акупаванай тэрыторыі дапушчальныя толькі дзеянні груп, арганізацый, атрадаў, якія кіруюцца інтарэсамі СССР. Адзначалася, што існаванне арганізацый, якімі кіруюць польскія буржуазныя цэнтры, неабходна трактаваць як проціпраўнае ўмяшанне ў справы нашай дзяржавы. Ставілася задача ствараць партызанскія атрады і «всеми способами выкрывать и распускать националистические отряды и группы». Радавых «акаўцаў» прапаноўвалася, па магчымасці, уключаць пад савецкім кіраўніцтвам у барацьбу з немцамі [2, с. 158; 6, с. 126; 8, с. 249–250; 10, с. 160–161; 23, л. 2–6аб].

Вобласць была месцам найбольшай колькасці баёў паміж партызанамі і АК. Ад моманту прыняцця вышэйзгаданых дакументаў і да снежня 1943 г. адбылося больш за 30 баёў і сутычак, падчас якіх былі забітыя і параненыя з абодвух бакоў. Адносіны рэзка абвастрыліся пасля таго, як брыгады імя І.В. Сталіна і М.В. Фрунзе 1 снежня 1943 г. акружылі лагер Стаўбцоўскага атрада АК і раззброілі яго байцоў. Па першым часе польскі атрад (камандзір К. Мілашэўскі) разам з партызанамі праводзіў аперацыі супраць акупантаў. Напрыклад, 19 чэрвеня 1943 г. пры падтрымцы партызан палякі напалі на гарнізон у Івянцы. У кастрычніку 1943 г. у атрад АК прыбыў эмісар польскага ўрада ў Лондане паручнік А. Пільх («Гура») з групай 14 чалавек і разгарнуў працу па дыскрэдытацыі камандзіра. Атрад па загадзе камандуючага Навагрудскай акругі АК быў перафарміраваны ў 1-ы батальён 76-га пяхотнага палка. Сам К. Мілашэўскі быў прызначаны ад'ютантам батальёна і адказным за супрацоўніцтва з партызанамі. Паміж партызанамі і «акаўцамі» адбылося некалькі сутычак. Улічваючы такую сітуацыю, Баранавіцкі падпольны абкам і Івянецкі падпольны райкам КП(б)Б правялі спецыяльнае расследаванне і прынялі рашэнне аб прымусовым расфарміраванні падраздзялення АК. Пасля раззбраення большасць радавых байцоў была накіравана ў атрады імя М.В. Фрунзе, А.В. Суворава, М.А. Шчорса, В.П. Чкалава, «Бальшавік». Краўніцтва і афіцэраў батальёна АК арыштавалі, абвінавацілі ў справе АК і сурова пакаралі [3, с. .40–41; 6, с. 124–125; 8, с. 258–259; 10, с. 163; 17, л. 116; 17, л. 116; 18, л. 29].

Пасля раззбраення польскага падраздзялення істотна ўзрасла колькасць баёў паміж партызанамі і структурамі АК, асабліва на Стаўбцоўшчыне і суседніх тэрыторыях. Аналіз іх дынамікі ў перыяд са снежня 1943 г. і да мая 1944 г. паказвае, што баі здараліся практычна кожны дзень. За 7 месяцаў перад вызваленнем Беларусі іх кольскасць склала 190, з якіх больш за 120 з удзелам Стаўбцоўска-Налібоцкага злучэння. У некаторых выпадках сутыкненні

насілі характар аперацый з агульным удзелам у іх да некалькіх соцень чалавек. Варта адзначыць, што з канца 1943 г. некаторыя атрады АК пайшлі на супрацоўніцтва з немцамі. Так, 9 снежня 1943 г. камандзір Стаўбцоўска-Налібоцкага злучэння АК А. Пільх заключыў з акупантамі дамову і да ліпеня 1944 г. атрымліваў ад іх зброю і рыштунак, якія браліся са складоў у Мінску. Аналагічнае пагадненне заключыў у Лідзе камандзір Наднёманскага злучэння АК Юзэф Svіда («Лех»). Фарміраванне на працягу студзеня – сакавіка 1944 г. атрымала 5 абозаў са зброяй. Прычым абодва камандзіры сцвярджалі, што іх дзеянні былі ўзгоднены з вышэйшым камандаваннем АК. Некалькі знізілася колькасць баявых сутыкненняў у пачатку лета 1944 г., што было звязана с падрыхтоўкай фарміраванняў АК да аперацыі «Вострая Брама» [7, с. 174, 177, 180, 182, 185; 8, с. 266–267; 18, л. 160, 166, 167].

Нягледзячы на вялікую колькасць канфліктаў, з лета 1943 г. да лета 1944 г. бакі час ад часу прадпрымалі некаторыя спробы заключыць перамір'е і спыніць канфрантацыю. Такія захады рабіліся камандаваннем партызан, падраздзяленняў НКДБ, а таксама з боку некаторых структур АК, якія базіраваліся ў раёне Налібоцкай і Ліпічанскай пушчаў. Аднак такія спробы былі адзінкавыя і ў асноўным датычыліся прадстаўлення партызанам бесперашкоднага праходу праз часова падкантрольную «акаўцам» тэрыторыю да камунікацый германскіх войск, а таксама ўзгаднення дзейнасці каманд, якія займаліся нарыхтоўкай прадуктаў харчавання [2, с. 157; 7, с. 210–211; 10, с. 156–157; 18, л. 28–33].

**Заключэнне**. Польскае прасавецкае падполле знаходзілася пад пільным кантролем структур КП(б)Б, партызанскага камандавання, а яго дзейнасць скіроўвалася на падпарадкаванне дзяржаўным інтарэсам СССР. Падпольныя групы, якія ўзнікалі як аўтаномныя адзінкі, з часам амаль усе былі ўключаны ў склад партызанскіх фарміраванняў, а з іх ліку ствараліся аддзяленні, узводы, роты, атрады. Асобныя са струтур пасля падрыхтоўкі накіроўваліся на тэрыторыю Польшчы для разгортвання там партызанскай барацьбы.

Узаемаадносіны партызан і структур АК залежалі ад адносін савецкага кіраўніцтва да польскага ўрада ў Лондане. У перыяд з ліпеня 1941 г. і да вясны 1943 г. мелі месца савецка-польскія дыпламатычныя адносіны і ў гэты час партызаны і структуры СУБ-АК суіснавалі адносна бесканфліктна. Кантакты насілі нефармальны характар, адбываліся ў абмежаваных маштабах і толькі па пэўных напрамках. Наступны этап – час жорсткай узброенай канфрантацыі, асноўная прычына якой – непрызнанне структурамі АК тэрыторыі Заходняй Беларусі як неад'емнай часткі БССР. Савецкае кіраўніцтва было катэгарычна супраць знаходжання ў рэгіёне любых падпольных структур, падпарадкаваных эмігранцкаму польскаму ўраду ў Лондане, і патрабавала ад партызанскага камандавання рашучых дзеянняў па іх ліквідацыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А.А. Каваленя, А.М. Литвин и др. – Минск: БЕЛТА, 2005. – 544 с.
2. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг.: В 2 кн. Кн. 2. – Минск: Беларуская навука, 2014. – 335 с.
3. Армия Краёва: военные, политические и правовые аспекты деятельности на Беларуси. Материалы научной конференции 14 апреля 1996 г. – Минск, 1996. – 86 с.
4. Літвін А. Армія Краёва на Беларусі: да праблемы вывучэння // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 1. – С. 65–71.
5. Літвін А. Армія Краёва на Беларусі: да праблемы вывучэння // Беларус. гіст. часоп. – 1994. – № 4. – С. 65–69.
6. Літвін А. Акупацыя Беларусі (1941–1944): пытанні супраціву і калабарацыі. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 288 с.
7. Барадзін З. Нёман – рака нязгоды. – СПб.: Невский Простор, 2018. – 333 с.
8. Ситкевич С.А., Сильванович С.А., Барабаш В.В. Польское подполье на территории западных областей Беларуси (1939–1954). – Гродно: ГГАУ, 2004. – 345 с.
9. Ермолович В.И., Жумарь С.В.Огнем и мечом: Хроника польского националистического подполья в Белоруссии (1939–1953 гг.). – Минск: БелНИЦДААД, 1994. – 112 с.
10. Сямашка Я.І. Армія Краёва на Беларусі. – Мінск: «Хата», 1994. – 270 с.
11. Языковіч Э.Ф. Партизанское движение в Беларуси в годы Великой Отечественной войны. – Минск: Нац. биб-ка Беларуси, 2021. – 255 с.
12. Кнацько Г.Д. Главное дело (вклад союза польских патриотов в СССР в создание демократической Польши). – Минск, 1988. – 25 с.
13. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / Л. Аржаева и др.; редкол.: А.Т. Кузьмин и др. – Минск: Беларусь, 1983–1985. – Т. 1 / редкол.: И.М. Игнатенко и др. – 1983. –591 с.
14. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): краткие сведения об орг. структуре / А.Л. Манаенков и др. – Минск: Беларусь, 1983. – 765 с.
15. За край родной: воспоминания партизан и подпольщиков Барановичской области: сб. / Ин-т истории АН БССР; сост. А.И. Залесский и др. – Минск: Беларусь, 1978. – 286 с.
16. Хацкевич А.Ф., Крючок Р.Р. Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР. – Минск: Наука и техника, 1980. – 320 с.
17. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 305.
18. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 307.
19. НАРБ. – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 322.
20. В едином строю: Воспоминания участников партизанского движения в Белоруссии. 1941–1944. – Минск: Беларусь, 1970. – 531 с.
21. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 643.
22. НАРБ – Ф. 4. Воп. 20. Спр. 214.
23. НАРБ – Ф. 4п. Воп. 33а. Спр. 397.

*Паступіў 07.05.2023*

# ВЗАИМООТНОШЕНИЯ БЕЛОРУССКИХ ПАРТИЗАН С ПОЛЬСКИМ ПОДПОЛЬЕМ НА ТЕРРИТОРИИ БАРАНОВИЧСКОЙ ОБЛАСТИ (1941–1944): ОРГАНИЗАЦИОННЫЙ И БОЕВОЙ АСПЕК

***А.А. КРИВОРОТ***
***(Институт истории Национальной академии наук Беларуси, Минск)***

*В статье рассмотрены взаимоотношения партизанских формирований Беларуси с польским подпольем на территории Барановичской области в 1941–1944 гг., представленное, с одной стороны, польскими просоветскими структурами, с другой – единицами, которые были подчинены польскому эмигрантскому правительству в Лондоне. Сделан вывод, что местные советские подпольные и партизанские структуры стремились оперативно налаживать взаимодействие с возникшими группами польского просоветского подполья и направлять их деятельность на активную борьбу с немецкими оккупантами. Организованные на основе таких групп партизанские единицы обычно включались в состав белорусских отрядов и бригад. Показаны основные факторы, которые влияли на характер взаимоотношений белорусских партизан и структур Армии Крайовой в разные периоды германской оккупации. Раскрыты содержание и формы взаимоотношений белорусских партизан и «аковцев» на протяжении двух этапов: июль 1941 г. – весна 1943 г. и лето 1943 г. – июль 1944 г.*

***Ключевые слова**: операция, отряд, бригада, гарнизон, соединение, подполье, взаимоотношения.*

# THE RELATIONSHIP OF THE BELARUSIAN PARTISANS WITH THE POLISH UNDERGROUND ON THE TERRITORY OF THE BARANOVICHI REGION (1941–1944): ORGANIZATIONAL AND COMBAT ASPECT

***A. KRYVAROT***
***(Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk)***

*The article studies the relationship of the partisan formations of Belarus with the Polish underground on the territory of Baranovichi region in 1941–1944, represented on the one hand by Polish pro–Soviet structures, and on the other handby units that were subordinated to the Polish emigrant government in London. It is concluded that local Soviet underground and partisan structures sought to establish quickinteraction with the emerginggroups of the Polish pro-Soviet underground and direct their activities towards an active fight against the German invaders. Partisan units organized on the basis of such groups were usually included in the Belarusian detachments and brigades. The main factors that influenced the nature of the relationship between the Belarusian partisans and the structures of the Home Army in different periods of the German occupation are shown. The content and forms of the relationship between the Belarusian partisans and the "Akovites" are revealed during two stages: July 1941 – spring 1943 and summer 1943 – July 1944.*

***Keywords:** operation, detachment, brigade, garrison, compound, underground, relationships.*